Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

10 ХІТРАСЦЯЎ ДЛЯ АГАРОДНІКАЎ

Нават калі вы не баіцеся запэцкаць рукі, працуючы ў садзе, мець пару «тузоў у рукаве» — гэта заўсёды добра. Прапануем некалькі «трукаў», якія варта ўзяць на заметку кожнаму садоўніку і агароднику. Асобныя парады могуць здацца дзіўнымі, але яны сапраўды працуюць!

1. Новы погляд на паліў

Расліны з доўгімі каранямі, якія сыходзяць глыбока ў глебу, вельмі часта недаатрымліваюць вільгаць нават пры шчодрым паліве. Але гэта лёгка выправіць, калі прыкапаць побач з такімі культурамі пусты пластыкавы кантэйнер з адтулінамі ў дне. Паліваючы расліны праз гэты гаршчок, вы можаце быць упэўнены, што яны атрымаюць неабходную ім вільгаць для добрага і здаровага росту. Асабліва такі паліў спадабаецца кабачкам.

2. Агарод у кантэйнеры

Калі ў вас вельмі маленькі ўчастак, гэта зусім не значыць, што вы не можаце вырасціць на ім усё, што пажадаеце. Знайдзіце ў продажы пластыкавы кантэйнер для захоўвання і высадзіце ў яго агародніну ці кветкі. Каб міні-градка была не вельмі цяжкай, на дно кантэйнера можна насыпаць дрэнаж. Дарэчы, такі праект можна рэалізаваць нават на балконе гарадской кватэры.

3. Падгузкі ў дачнай гаспадарцы

Многія нават не падазраюць, што падгузкі ўжываюць у кветкаводстве. А між тым крэатыўныя дачнікі прыдумалі ўкладваць іх на дне кветкавых гаршкоў і кашпо. Уся справа ў тым, што матэрыял, які выкарыстоўваецца ў падгузках, затрымлівае вільгаць, але карані раслін пры гэтым не загніваюць. Такі спосаб вырошчвання лепш за ўсё падыходзіць для адналеткаў, якія патрабуюць частага паліву. Цяпер, нават калі вы бываеце на дачы рэдка, можаце не турбавацца пра любімыя расліны: яны не загінуць.

4. Паліў «чароўнай» вадой

Не вылівайце ваду, у якой варылася агародніна: такі адвар насычаны пажыўнымі рэчывамі, дзякуючы якім многія расліны ў садзе будуць расці на зайздрасць суседзям. Толькі не паліваўце кветкі кіпнем, дачакайцеся, пакуль булён астыне. Ён прыдатны для паліву як садовых і агародных культур, так і гаршковых раслін. Піць «агароднінную» ваду карысна і людзям. У спякоту яна добра праганяе смагу. Але гэта ўжо справа густу.

5. Кававыя фільтры для кветкавых гаршкоў

Кожны раз, паліваючы кветкі, вы можаце заўважыць, што разам з вадой, якая выцякае, з дрэнажнай адтуліны прасыпаецца грунт. Фільтры для кавы, размешчаныя на дне гаршка, дазволяць вадкасці сцячы, але ўтрымаюць субстрат унутры. Такі прыём ідэальны для пакаёвых раслін, а таксама для вулічнага кантэйнернага саду.

6. Пасадка «гаршчок у гаршку»

Не ўсе садоўнікі любяць кардынальна мяняць дызайн участка кожны новы сезон. Вядома, перамен хочацца, але звычайна гэта адбірае шмат сіл і часу. Аднак ёсць адна невялікая хітрасць, якая дазваляе мяняць месцамі пасадкі, калі вам гэтага захочацца. Проста закапайце ў зямлю некалькі пластыкавых гаршкоў і ўстаўце ў іх сезонныя кантэйнерныя расліны. Калі кветкі страцяць дэкаратыўнасць, іх можна лёгка замяніць новымі. Так ваш кветнік заўсёды будзе прыгожы і прыбраны.

7. Калі патрэбна цяплічка для зеляніны і расады...

У гэтым выпадку вас зноў выратуюць пластыкавыя бутэлькі. Ва ўласнай мініяцюрнай аранжарэі кожны сеянец будзе развівацца з дзіўнай хуткасцю. А ўсяго і трэба, што адрэзаць у звычайнай пластыкавай бутэлькі рыльца і накрыць ёю гаршчок з раслінай. Проста і зручна!

8. Высокая градка з шлакаблокаў

Звычайна пабудова высокай градкі патрабуе пэўных навыкаў (асабліва для жанчын). Аднак калі ў вас ёсць блокі з шлакабетону з вялікімі адтулінамі — задача спрашчаецца ў разы. З дапамогай гэтых будаўнічых камянёў можна стварыць градку любога памеру. Што яшчэ немалаважна, расліны можна высаджваць не толькі ў цэнтры, але і ў адтулінах у блоках.

9. Насенне і цытрусы

Выкарыстоўвайце ў якасці ёмістасцяў для расады абалонку лімона або апельсіна. Па-першае, гэта міла. Па-другое, расліна будзе спажываць з лупіны цытрусавых пажыўныя рэчывы. Па-трэцяе, гэты спосаб пасадкі вельмі бюджэтны.

10. Яечная шкарлупіна: не смецце, а ўгнаенне

Шкарлупіна ад яек заўсёды адпраўляецца ў смеццевае вядро, а павінна б — у агарод. Перамолатая яечная шкарлупіна — выдатнае ўгнаенне, здольнае павысіць ураджайнасць большасці агародных культур.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.24	17.10	7.46
Віцебск —	9.24	17.10	7.46
Магілёў —	9.14	17.00	7.46
Гомель —	9.03	17.05	8.02
Гродна —	9.38	17.27	7.49
Брэст —	9.31	17.35	8.04

Месяц

Апошняя квадра 9 студзеня.
Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Імяніны

Пр. *Агафіі, Зіновіі, Ігната, Ніканора, Пятра, Яфіма.*
К. *Адрыяна, Ады, Вільгельма, Дануты, Рыгора, Яна.*



Фота Максіма ШАСТАКОВА.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

10 СТУДЗЕНЯ

У краіне

1918 год — нарадзіўся (в. Барысавічы Клімавіцкага раёна) Дзмітрый Пятровіч Жмуроўскі, Герой Савецкага Саюза, доктар гістарычных навук, прафесар. У гады Вялікай Айчыннай вайны служыў на Бранскім, Калінінскім, 2-м Украінскім франтах. Вызначыўся ў сакавіку 1944 г. пры фарсіраванні ракі Прут, будучы цяжка параненым, не пакінуў поля бою. Пасля вайны працаваў на кафедры гісторыі КПСС Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Аўтар даследаванняў па гісторыі КПСС і КПБ. Памёр у 2010 годзе.

1920 год — адбылося першае пасяджэнне Лігі Нацый, першай палітычнай міжнароднай арганізацыі. Мэты арганізацыі ўключалі ў сябе: раззбраенне, прадухіленне ваенных дзеянняў, гарантаванне калектыўнай бяспекі, урэгуляванне спрэчак паміж краінамі шляхам дыпламатычных перагавораў, а таксама паляпшэнне якасці жыцця на планеце. Паміж 1920 і 1946 гадамі 63 краіны сталі яе членамі. Першапачаткова ў Лігу Нацый увайшло 44 дзяржавы, 31 з іх прымала ўдзел у Першай сусветнай вайне на баку Антанты, а 13 дзяржаў прытрымліваліся нейтралітэту. ЗША не ратыфікавалі статут Лігі Нацый і не ўвайшлі ў лік яе членаў, а Савецкая Расія не была туды запрошана. Ліга Нацый была ліквідаваная 18 красавіка 1946 года. Яе актывы і абавязацельствы былі перададзены ў ААН.

1930 год — нарадзіўся (в. Селівонаўка, цяпер у Маладзечанскім раёне) Фёдар Мікалаевіч Капуцкі, акадэмік НАН Беларусі, доктар хімічных навук, прафесар, заслужаны работнік вышэйшай школы Беларусі. У 1973—1985 гадах — намеснік, першы намеснік міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР. У 1990—1996 гадах — рэктар Белдзяржуніверсітэта. Аўтар больш як 500 навуковых прац, у тым ліку дзвюх манаграфій, двух падручнікаў, каля 200 вынаходак. Навуковыя працы ў галіне структурнай і хімічнай мадыфікацыі цэлюлозы і яе вытворных. Памёр у 2017 годзе.

У свеце

1863 год — у Лондане адкрыўся рух па першай у свеце падземнай чыгунцы — метро. Працягласць першай лініі склала каля шасці кіламетраў.

1883 год — нарадзіўся Аляксей Мікалаевіч Талстой (1883—1945), рускі пісьменнік, грамадскі дзеяч, акадэмік АН СССР. У 1914—1916 гадах — ваенны карэспандэнт газеты «Русские ведомости». У 1918—1923 гадах быў у эміграцыі. Аўтар трылогіі «Блуканне па пакутах», гістарычнага рамана «Пётр I», навукова-фантастычных раманаў «Аэліта», «Гіпербалоід інжынера Гарына», многіх апавяданняў, п'ес. Тройчы лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР.

1920 год — уступіў у сілу Версальскі мірны дагавор, які завяршыў Першую сусветную вайну.

УСМІХНЕМСЯ

Суперзагул — гэта калі грошы скончыліся і вы ідзяце здаваць пародзістага і дарагога ката ў ламбард.

Муж прыходзіць п'яны дадому. Жонка, як звычайна, пачынае яго пілаваць:

— Ты, п'яная свіння...

— Цішэй, жанчына! У мяне сёння свята!

— Якое яшчэ свята?

— Дзень грамадзянскай авіяцыі!

— А ты тут пры чым? Ты ж сантэхнік!

— Хто толькі што на аўтапілоце прыйшоў?..

Тэхналагічная рэвалюцыя, свет «разумных рэчаў».

Хутка можна будзе патэлефанаваць на халадзільнік, каб ён перадаў чайніку, што пара заліць ваду ў пыласос і прас, і каб гэтыя два блазны не расслабляліся, пакуль пральная машына адціскае.

Двое разгадваюць крыжаванку.

— Старадаўняе грузінскае віно, 13 літар...

— Па гарызанталі ці па вертыкалі?

— Сапраўды! «Пагарызанталі»...

Малюнак Уладзіміра ЧУГЛАЗАВА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 242.
Нумар падпісаны ў 19.30 9 студзеня 2018 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12